# ПАЛАЖЭННЕ
аб Кансультатыўным савеце па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь

1. Дадзенае Палажэнне вызначае кампетэнцыю і парадак дзейнасці Кансультатыўнага савета па справах беларусаў замежжа пры Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь (далей - Савет).

2. Савет з'яўляецца дарадчым, кансультацыйным і экспертным органам, які ўдзельнічае ў абмеркаванні найважнейшых аспектаў, ініцыятываў, у тым ліку праектаў нарматыўных прававых актаў, накіраваных на правядзенне максімальна эфектыўнай дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа.

3. Савет у сваёй дзейнасці кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, актамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, законамі Рэспублікі Беларусь, пастановамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і дадзеным Палажэннем.

4. Асноўнымі задачамі Савета з'яўляюцца:

падрыхтоўка прапаноў па ўдасканаленні дзяржаўнай палітыкі ў галіне адносін з беларусамі замежжа;

садзейнічанне стварэнню эфектыўных механізмаў супрацоўніцтва дзяржаўных органаў і арганізацый Рэспублікі Беларусь з беларусамі замежжа ў культурнай, адукацыйнай, інфармацыйнай і іншых сферах;

распрацоўка рэкамендацый па аказанні беларусам замежжа практычнай дапамогі ў захаванні і развіцці нацыянальна-культурнай самабытнасці;

садзейнічанне эфектыўнай каардынацыі дзеянняў грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа ў рэалізацыі імі грамадзянскіх, сацыяльна-культурных і іншых правоў з улікам нормаў міжнароднага права і заканадаўства дзяржаў грамадзянскай прыналежнасці членаў грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа;

унясенне прапаноў аб выкарыстанні патэнцыялу беларусаў замежжа для развіцця беларускай дзяржавы;

падрыхтоўка прапаноў па прыцягненні беларусаў замежжа да ўдзелу ў рэалізацыі сацыяльна-эканамічных, грамадска-культурных і іншых праграм, якія праводзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за мяжой.

5. Пасяджэнні Савета праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей аднаго раза ў год.

Узначальвае Савет Старшыня - Міністр замежных спраў.

6. Старшыня Савета:

праводзіць пасяджэнні Савета або прадастаўляе паўнамоцтвы на правядзенне пасяджэння Савета іншай асобе з ліку членаў Савета альбо

намеснікаў Міністра замежных спраў;

арганізуе работу Савета;

вызначае месца і час правядзення пасяджэнняў Савета;

вызначае кола пытанняў для разгляду на пасяджэннях Савета;

падпісвае пратакол пасяджэння Савета;

прымае меры па рэалізацыі рашэнняў Савета.

7. У склад Савета ўваходзяць прадстаўнікі найболын буйных краінавых дыяспар беларусаў замежжа, дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый да мэтаў і задачаў якіх адносіцца супрацоўніцтва з беларусамі замежжа.

Тэрмін знаходжання ў складзе Савета звычайна не павінен перавышаць за тры гады.

8. Савет можа прыцягваць да ўдзелу ў пасяджэннях выбітных прадстаўнікоў беларусаў замежжа, іншых дзяржаўных органаў, а таксама грамадскіх арганізацый (з іх згоды) у якасці экспертаў- кансультантаў.

9. Пасяджэнне Савета лічыцца правамоцным, калі на ім прысутнічае не менш за палову яго складу.

10. Рашэнні Савета прымаюцца простай болынасцю галасоў членаў Савета, якія прысутнічаюць на пасяджэнні, адкрытым галасаваннем у ходзе пасяджэння альбо шляхам пісьмовага апытання членаў Савета. Пры роўнасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас Старшыні Савета.

Рашэнні Савета афармляюцца пратаколам і носяць рэкамендацыйны характар.

11. Арганізацыйнае, метадычнае і тэхнічнае забеспячэнне працы Савета ажыццяўляецца Сакратарыятам Савета.

12. Сакратарыят Савета:

арганізуе падрыхтоўку пасяджэнняў Савета;

даводзіць да членаў Савета інфармацыю пра дату, час і месца правядзення пасяджэнняў Савета;

ажыццяўляе падлік галасоў у ходзе галасавання;

вядзе пратакол пасяджэння Савета;

у 15-дзённы тэрмін з дня правядзення пасяджэння Савета забяспечвае афармленне пратаколу і даводзіць яго да зацікаўленых;

арганізуе працу па аднаўленні складу Савета;

выконвае іншыя функцыі, звязаныя з забеспячэннем дзейнасці Савета.

Функцыі Сакратарыята Савета выконвае галоўнае ўпраўленне шматбаковай дыпламатыі Міністэрства замежных спраў.

13. Члены Савета маюць права:

атрымліваць інфармацыю аб дзейнасці дзяржаўных органаў у сферы адносін з беларусамі замежжа;

уносіць Старшыні Савета прапановы па выкананні ўскладзеных на Савет задач;

уносіць прапановы аб фарміраванні парадку дня пасяджэнняў Савета;

выступаць на пасяджэннях Савета.